**СКЛАДАНЫ СКАЗ З РОЗНЫМІ ВІДАМІ СУВЯЗІ**, к а м б і н а в а н ы с к л а д а н ы с к а з, складаная сінтаксічная адзінка, прэдыкатыўныя часткі якой звязваюцца адначасова злучнікавай (злучальнай ці падпарадкавальнай) і бяззлучнікавай сувяззю. Прэдыкатыўныя часткі могуць звязвацца бяззлучнікавай і злучальнай сувяззю: *Не шасцяць каласы, звон не валіцца з касы, не кладуцца ў стог пласты, толькі сыплюцца лісты на яловыя кусты, на сухія верасы* (Я. Купала); бяззлучнікавай і падпарадкавальнай сувяззю: *Нездарма, напэўна, нездарма даўняя прыкмета ёсць такая: недзе там, на захадзе, вайна, калі гэтак полымя шугае* (А. Астрэйка); злучальнай і падпарадкавальнай сувяззю: *Хвалі цэдзіць скрозь балота, і люстраная вада абмывае пыл з чароту, што паслаўся, як нуда* (А. Гурло); бяззлучнікавай, злучальнай і падпарадкавальнай сувяззю: *Барсук нару прыкрыў увішна, адцвіў і адп'яніў чабор, а ты* [бор] *сцяною непахіснай стаіш вятрам наперакор, бо ты, вячысты, як той гарністы, усіх завеш на свой парог* (П. Броўка). Камбінацыя і паслядоўнасць прымацавання прэдыкатыўных частак можа быць самай разнастайнай.

Ад складаных сказаў з рознымі відамі сувязі, часткі якіх звязаны злучальнай і падпарадкавальнай сувяззю, трэба адрозніваць складаназалежныя сказы ўскладненай будовы з сузалежным аднародным падпарадкаваннем даданых частак, што аб'яднаны пры дапамозе злучальнай або бяззлучнікавай сувязі, ці складаназалежныя сказы ўскладненай будовы са змешаным падпарадкаваннем дадаых частак: *Вельмі любіў Кастусьназіраць за навальніцаю ўночы, калі маланкі пісагуюць неба, а далёкія грымоты зліваюцца ў дзівосную музыку-кананаду* (С. Александровіч); *Стаяў той асаблівы прыгожы дзень, якія бываюць звычайна ў канцы жніўня, калі даўно скончана жніво, звезена жыта ў гумны і над апусцелым полем дружна ўзлятаюць стайкі шпакоў – прадвеснікаў блізкай восені* (М. Лынькоў).

Прэдыкатыўныя часткі складаных сказаў з рознымі відамі сувязі могуць мець розную будову (быць аднасастаўнымі і двухсастаўнымі, поўнымі і няпоўнымі, ускладненымі і няўскладненымі): *Замаўкаюць птушыныя звонкія спевы, калі восень прыходзіць у край наш лясны, і, як свечкі, вакол ярка ўспыхваюць дрэвы на праводзінах лет, на памінках зімы* (А. Куляшоў); *Не залаты зусім, не срэбны, быў на табе заўсёды ўбор звычайны самы, самы зрэбны: зялёны луг ды сіні бор, каля дарогі жыта ў полі, вярба старая ля ракі ды ў жоўтым восеньскім прыполе рабін даспелых аганькі* (Г. Бураўкін); *Штогод адзін кірунак маю, як адпачынак прыйдзе мой, – не жыў, калі не пабываю на Магілёўшчыне маёй* (Д. Сасёў).

Незалежна ад колькасці прэдыкатыўных частак у межах складаных сказаў з рознымі відамі сувязі вылучаюцца, як правіла, дзве асноўныя структурныя часткі (М.С. Яўневіч), або іх яшчэ называюць – складаныя састаўныя часткі (І.Л. Бурак). Структурныя часткі – гэта больш аб'ёмныя семантыка-сінтаксічныя адзінствы, якія арганізуюцца па мадэлі складаназлучаных, складаназалежных або бяззлучнікавых складаных сказаў (гл. **ТЫПЫ СКЛАДАНЫХ СКАЗАЎ З РОЗНЫМІ ВІДАМІ СУВЯЗІ**). Будова, сінтаксічныя адносіны паміж прэдыкатыўнымі і структурнымі

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

часткамі, а таксама іх інтанацыйнае афармленне адпавядаюць аналагічным складаназлучаным, складаназалежным і бяззлучнікавым складаным сказам. У такіх сказах можа быць самая разнастайная камбінацыя прэдыкатыўных частак.

*С.С. Мароз*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ